Магілёўскі гарадскі выканаўчы камітэт

Аддзел культуры Магілёўскага гарвыканкама

Установа культуры
«Музей гісторыі Магілёва»

# ГІСТОРЫЯ МАГІЛЁВА: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ

Зборнік навуковых прац
удзельнікаў VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі

26 – 27 чэрвеня 2013 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Магілёў
2013

УДК 947.64–25
ББК 63.3 (2 Б)
Г51

Навуковыя рэцэнзенты:
доктар сацыялагічных навук, прафесар *Ю. М. Бубнаў*
доктар гістарычных навук, прафесар *І. А. Марзалюк*

Укладальнікі:
Бацюкоў А. М.
Пушкін І. А.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць** : зборнік навуковых прац
Г51 удзельнікаў VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Магілёў, 26 – 27 чэрвеня 2013 г. / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў : УА «МДУХ», 2013. – 436 с.
ISBN 978-985-6985-13-6.

У зборнік «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць» увайшлі навуковыя працы ўдзельнікаў VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць», якая адбылася ў г. Магілёве 26–27 чэрвеня 2013 г. . У канферэнцыі бралі ўдзел навукоўцы з Беларусі, Германіі, Польшчы, Расіі і Украіны. У зборніку захаваныя погляды, арфаграфія і мова аўтараў, таму за магчымыя недакладнасці і спрэчныя моманты ў тэксце адказнасць нясуць аўтары.

**УДК 947.64–25**
**ББК 63.3 (2 Б)**

**ISBN 978-985-6985-13-6**

© Аддзел культуры Магілёўскага гарвыканкама, 2013
© УК «Музей гісторыі Магілёва», 2013

**Литература**

1. Национальный архив Республики Беларусь (далее – НА РБ). Ф. 1450. Оп. 8. Д. 178.
2. НА РБ. Ф. 4159. Оп. 1. Д. 3.
3. НА РБ. Ф. 1450. оп. 8. Д. 225.
4. Белоусов К.М. Зарево над Друтью. – Мінск, 1990.

***І. Л. Калечыц***
г. Мінск, БДПУ імя М. Танка

## ЯК МСЦІСЛАЎСКАЯ КАФЛЯ ДАПАМАГЛА Ў РАСШЫФРОЎЦЫ ПОЛАЦКАГА ГРАФІТА

Сярод графіта Спаса-Праабражэнскай царквы г. Полацка можна вылучыць не толькі надпісы, але і рысункі, якія ў большасці сваёй не суправаджаюцца надпісамі. Нават, калі надпіс знаходзіцца каля рысунка, не заўсёды стоадсоткава можна вызначыць, ці звязаны яны паміж сабой. Гэта стварае складанасць у датаванні рысунка.

Надпісы, якія дакладна звязаны з рысункам – гэта графіці двух тыпаў. Першыя з іх – выявы крыжоў, часцей за ўсё галгофскіх, якія суправаджаюцца кананічным надпісам ІС ХС НІКА («Ісусам Хрыстом перамагай»). І, хаця разгорнуты надпіс каля галгофскага крыжа дапускае нанясенне яшчэ шэрагу надпісаў, часцей за ўсё, наносіліся ці захоўваліся не ўсе літары. Другая катэгорыя – імёны і прозвішчы, якія наносіліся разам з гербавымі выявамі. Такіх выяваў пакуль знойдзена пяць. Гэта гербы Ружа, Адравонж, Абданк, Ляліва і гербавы знак Іааннеса Курэка, які пакуль што намі не вызначаны.

Шэраг рысункаў стасуюцца з графіці гіпатэтычна. Гэта, напрыклад, графіта пра «вымя» і выява каня каля яго. Выява галавы жывёлы і фрагмент надпісу, якія знаходзяцца на вышыні 74 см ад падлогі на паўднёвай грані паўночна-заходняга слупа, немагчыма аднавіць цалкам, таму што кавалкі тынкоўкі ў гэтым месцы згублены. Надпіс, па ўсёй верагоднасці, тлумачыць рысунак, які прадстаўляе сабой галаву жывёлы з рагамі або вушамі, вокам і шыяй, ад якой адыходзяць грыва або поўсць, паказаная штрышкамі. У надпісу добра чытаюцца словы вым#  еh, г.зн. «яе вымя». Можна дапусціць, што на рысунку – каза або карова. Падаецца верагодным, што гэта ўсё ж такі выява каня. На карысць гэтага сведчаць вушы, а не вушы і рогі, а таксама грыва. Даенне кабыл не было распаўсюджана на тэрыторыі тагачаснай Беларусі, таму можна дапусціць, што выява каровы, якая была побач, не захавалася.

Тры галавы ў профіль змешчаны на паўднёва-заходняй грані паўднёва-усходняга слупа. Такія схематычныя выявы характэрны для сярэдневякоўя: твары з пакатымі лбамі, вострыя насы, губы на партрэце справа складзены трубачкай, на сярэднім – паказаны рысачкай. Па тварах прарэзаны надпіс:

Спиридъ попъ добры – «Спірыдон – добры поп». Ці носіць імя Спірыдон адзін з людзей на рысунку або гэта разначасовыя графіці – дакладна сказаць немагчыма. Трэці твар нагадвае галаву птушкі.

У шырокім дыяпазоне XII–XVI ст. можна датаваць выявы кошкі на заходняй сцяне праёма паміж дыяканнікам і алтаром, таму што лацінамоўны надпіс, які ідзе паверх выявы, датуецца пачаткам XVII ст. Графіці-жывёлы прадстаўлены выявамі кошак. Такія выявы знойдзены ў Беларусі ўпершыню. Дзве постаці кошак выяўлены на заходняй сцяне праёма паміж дыяканнікам і алтаром. Верхняя кошка – «вясёлая». Яна бадзёра крочыць ў правы бок. Адна з яе лап сагнута ў калене, што ўвогуле нехарактэрна для гэтых жывёл. Вялізныя вочы глядзяць на спіну. Пашча адчынена, – жывёла нібыта ўсміхаецца. Кошка – паласатая. Паказана, хаця і даволі няўдала, яе храбціна з палоскамі на скуры, якія, аднак, ідуць не па спіне, а па баку такім чынам, што нагадваюць рэнтгенаўскі здымак шкілета з'едзенай рыбы. Частка хваста і заднія лапы перакрыты лацінамоўным надпісам. Ніжэй нарысавана другая, «сумная» кошка. У яе кароткі закручаны хвост. Добра захаваліся выявы двух пярэдніх лап, правай, нават, з дзвума кіпцюрамі, і адной задняй. Галава кошкі авальная, захавалася выява адаго вуха. Пысак зацёрты, аднак відаць вялізныя вочы і вусы. Гэтая кошка – лахматая, яе поўсць паказана групамі рысачак. Тулавы абедзьвух кошак павернуты ў профіль, а галовы – у анфас і нарысаваны ў рознай манеры. Над першай кошкай відаць абрысы верха кашачай галавы: вушы і лоб. Відаць, гэта была першая няўдалая спроба нарысаваць жывёлу. Нам прадстаўляецца, што гэта не проста малюнак нейкай абстрактнай кошкі. Абедзьве жывёлы былі добра вядомы аўтару (ці аўтарам) рысункаў. Аб гэтым сведчыць такая дэталізацыя як палоскі на адным і схематычна паказаная поўсць на другім рысунку. Трэцяя кошка, якая нарысавана насупраць, на ўсходняй сцяне, мае тлустае тулава, хвост, выцягнуты ўверх перпендыкулярна да цела. Яна ляжыць, яе лапы выцягнуты ўбок. Зноў жа, гэта не абстрактная, а канкрэтна вядомая аўтару жывёла, – на яе лапках нарысаваны шкарпэтачкі, якія звычайна бываюць белага колеру.

Антрапаморфныя выявы сустракаюцца па ўсёй прасторы царквы. На паўночнай сцяне храма на вышыні да метра размяшчаюцца разнастайныя рысункі. Няглядзячы на тое, што ў постацяў няма ні рук, ні ног – гэта дакладна выявы чалавека. Хутчэй за ўсё, гэта выявы святароў ці манахаў. Так, на вышыні 91 см ад падлогі знаходзіцца выява чалавека памерамі прыблізна 7×7 см. Дзесці пасярэдзіне яна перасечана дзвума паралельнымі лініямі, якія, відаць, абазначаюць пас. Лінія злева, да якой прырысавана наверша, мабыць, абазначае посах. Такім чынам, гэта можа быць постаць епіскапа. Постаць, прачэрчаная крыху вышэй, – схематычная выява чалавека. Памеры рысунка 4,5×3 см. Яшчэ адзін рысунак, які знаходзяцца на той жа сцяне на вышыні 82,5 см ад падлогі таксама з'яўляецца схематычнай выявай постаці чалавека. Злева ад постаці запісана слова молитс#. Вышня літар вельмі невялікая, усяго 0,4 см. Слова мае даўжыню 4,7 см. Адпаведна надпісу, гэта, хутчэй за ўсё, постаць манахіні, якія стаяць на малітве.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

У супрацьлеглым баку, у аркасоліі паўднёвай сцяны ёсць рысунак чалавечка ў поўны рост. Ён даволі схематычны: мае круглую галаву з вачамі-кропкамі, паўкруглы жывот, ад якога адыходзяць ручкі і ножкі. На ручках розная колькасць пальцаў: сем на правай і чатыры на левай. Ножкі растапыраны ў бакі, яны завершаны як птушыныя лапкі, паміж імі – арнамент. Што ён сімвалізуе – складана сказаць. Можа гэта – фалічны сімвал, а можа, наадварот, гэта жанчына, і арнамент – аздабленне на спадніцы, якая, аднак, не завершана ўнізе. У правай руцэ чалавечак трымае касу. Надпіс над ім можна гіпатэтычна прачытаць як «А засяку».

Такі ж незразумелы рысунак, дзе складана вызначыцца з полам чалавека, ёсць на паўднёвай сцяне дыяканніка. Пакуль не была зроблена прарысоўка, постаць трактавалася як выява шляхцянкі, бо адразу была заўважна заштрыхаваная прыталеная сукенка, нехарактэрная для старажытнарускага жаночага строя. Такой жа штрыхоўкай пазначана рэч, якую постаць трымае ў руках: плашч ці веер? Прыцягвае ўвагу прычоска, дзе кароткія валасы падняты ўверх і тырчаць ва ўсе бакі. Аднак, з такой жа верагоднасцю сукенка можа быць татарскім халатам, плашч – шчытом, што карэнным чынам змяняе трактоўку рысунка.

Добрая выява вершніка на кані змяшчаецца на паўднёвай сцяне ахвярніка каля самага праёма. У жывёлы добра прарысаваны вялікія вочы і губы, шырокае цела і чатыры нагі з капытамі. Задняя частка рысунка сапсавана. На кані сядзіць воін у даспехах. На ім востраканечшы шлем і кальчуга, схематычна паказаная перпендыкулярнымі рысамі як рашотка. Такія ж выявы announcementsў сустракаюцца і на костках з гарадзішча Маскавічы [1, с. 301]: востраканечны шлем і паказаная штрыхоўкай кальчуга. Над галавою занесены меч, які вершнік трымае ў выцягнутай правай руцэ. У левай – павады. Гарда мяча не пазначана, воін трымае яго ў выцягнутых пяці пальцах. Ногі воіна паказаны схематычна, у выглядзе двух ліній, якія спускаюцца з аднаго боку каня. Мужчына сталы, барадаты. Насупраць яго, справа, знаходзіцца вораг, які паказаны больш схематычна. У яго круглая безвалосая галава, вялікія вочы і вусы. Магчыма, ён таксама сядзіць на кані, які амаль не прарысаваны і паказаны дзвума паралельнымі рысамі. Схематычна паказана адна рука, якая трымае зброю. Хто мог быць гэты вораг. Няма прыкмет, па якіх яго можна было аднесці да канкрэтнай «нацыянальнасці». Можа быць, гэта татарын, калі улічыць наяўнасць вусоў і лысай галавы. Хутчэй за ўсё, гэта нейкі «сімвалічны» вораг. Пры першым позірку на яго адразу ўспамінаецца быліна пра «ідалішча паганае». У адрозненне ад ворага, воін на кані быў добра вядомы мастаку. Улічваючы такі элемент як барада, можна сказаць, што мастак рысаваў нейкага канкрэтнага, добра вядомага яму дружынніка, а, магчыма, нават і князя.

Больш позняя выява воіна знаходзіцца ў алтары, каля падлогі на паўночнай сцяне. Гэта шляхціц. Яго вопратка паказана схематычна. На галаве капялюш з пяром. У руках ён трымае сякеру з доўгім дрэўкам. Партрэт не схематычны, з вялікай доляй верагоднасці можна сказаць што ён

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

мае падабенства з прататыпам. У шляхціца высокі лоб і кароткія валасы. У яго вялікі мясісты нос і падбародак, нізкія надбрыўныя дугі і пышныя вусы. Гэтая выява вельмі нагадвае карціну Рэмбрандта «Портрэт польскага шляхціца» 1637 г., дзе намаляваны Анджэй Рэй, пасол Рэчы Паспалітай у Англіі, сакратар Уладзіслава IV.

Цікавы рысунак знаходзіцца на сцяне каля келлі Ефрасінні Полацкай. Гэтая выява адразу прыцягвае да сябе ўвагу спалучэннем выразнасці і схематычнасці. У постаці круглая галава з вялікімі вачыма, добра азначанымі брывамі і носам. Адзенне і галаўны ўбор разыходзяцца трохвугольнікамі, якія заштрыхаваны. Злева тырчыць выцягнутая рука з пяццю завостранымі пальцамі. Адразу ўзнікаюць два пытанні: хто гэта і якім часам мы можам датаваць гэтую выяву? Аналагі полацкаму графіта знойдзены. Гэта кафля з Мсціслава і чарнільніца з Полацка. Полацкая чарнільніца была знойдзена на адлегласці 30 м ад Барысаглебскай царквы [2, с. 186]. Гэта ўнікальны артэфакт. Чарнільніца была зроблена на ганчарным крузе, а малюнак прадрапаны да абпальвання. Заключэнне аб тым, што гэта менавіта выявы князёў Барыса і Глеба, базуецца на двух аргументах: першы – месца знаходкі каля царквы Барыса і Глеба, другі – супадзенне выяваў на чарнільніцы з выявай цара на кафлі, знойдзенай І. Марзалюком у Мсціславе [2, с. 187]. Абедзве гэтыя выявы амаль стоадсоткава ідэнтычныя полацкаму графіта. Такім чынам, гэта выява князя ў характэрнай трапецыяпадобнай шапцы. Ці можна датаваць гэтую выяву? Мсціслаўская кафля датуецца сярэдзінай XVII ст., а полацкая чарнільніца – мяжой XVI–XVII стст. Д. Дук сведчыць, што такая выява князя была кананічнай у дадзены час. Таму і мы можам датаваць графіта межамі канца XVI – сярэдзінай XVII стст. Так выява на мсцілаўскай кафлі дапамагла ў вызначэнні і датаванні графіта.

Такім чынам, сярод рысункаў-графіці Спаса-Праабражэнскай царквы г. Полацка сустракаюцца выявы, якія дакладна суправаджаюцца подпісамі, суправаджаюцца імі ўмоўна або зусім не маюць подпісаў. Калі датаванне першай катэгорыі рысункаў магчыма па палеаграфіі надпісаў, якія іх суправаджаюць, то датаванне другой і трэцяй катэгорыі надпісаў прадстаўляе складанасць. Вызначальную ролю тут адыгрывае сам рысунак і паралелі, якія можна знайсці сярод роднасных выяў. Прыкладам таму з'яўляецца графіта з выявай князя, якая мае аналагі на мсціслаўскай кафлі і полацкай чарнільніцы.

**Літаратура**

1. Калечыц, І.Л. Эпіграфія гарадзішча Маскавічы / І.Л. Калечыц // Гісторыя і археалогія гарадзішча Маскавічы. – Сб. нав. артыкулаў у гонар Л.В. Дучыц. – адк.рэд. В.М. Мядзведзева. – Рыга, 2013. – С. 291–308.

2. Дук, Д.У. Унікальная знаходка з Полацка – керамічная чарнільніца з выявай князёў Барыса і Глеба // Д.У.Дук. – Гіст.-археал.зб. – 2005. – № 20. – С. 186–189.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ